жр 3221

Библиотека АН БССР

СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ

ПРАЧЫТАЙ І ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ

# ПАРТЫЗАН

Орган Калінкавіцкага РК КП(б)Б

№ 14(258) | Серада, 18 жніўня | 1943 года.

## Удары нашай авіяцыі

У ноч на 15 жніўня наша авіяцыя зноў падвергла моцнай бамбардыроўцы нямецкія воінскія эшалоны з войскамі і тэхнікай на чыгуначных вузлах Палтава, Красаград і Рославль.

Узнікла звыш 40 пажараў, якія суправаджаліся ўзрывамі вялікай сілы.

## ЗАГАД
### Вярхоўнага Галоўнакамандуючага

15 жніўня г. г. у выніку упорных баёў 16 і 84 гвардзейскія стралковыя дывізіі, 238 і 369 стралковыя дывізіі вызвалілі горад КАРАЧАЎ ад нямецкіх захопнікаў, паказаўшы пры гэтым мужаства і ўмеласць баявых дзеянняў.

У азнаменаванне дасягнутых поспехаў 16 і 84 гвардзейскім стралковым дывізіям, 238 і 369 стралковым дывізіям, вызваліўшым горад КАРАЧАЎ, прысвоіць найменаванне «Карачаўскіх» і надалей іх іменаваць:

16 Гвардзейская Карачаўская стралковая дывізія.
84 Гвардзейская Карачаўская стралковая дывізія.
238 Карачаўская стралковая дывізія.
369 Карачаўская стралковая дывізія.

Вярхоўны Галоўнакамандуючы
Маршал Совецкага Саюза **І. СТАЛІН.**

15 жніўня 1943 г.

## НА ФРАНТАХ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ
### (З АПЕРАТЫЎНЫХ ЗВОДАК)

На днях нашы войскі, размешчаныя паўночна-заходнее і паўднёва-усходнее Спас-Дземенска перайшлі ў наступленне супроць нямецка-фашысцкіх войск. Наступленне началося з двух напрамкаў, з раёна паўночна - заходнее на поўдзень і паўднёва-усходнее на паўночны—захад.

Нашы войскі, наступаючыя паўночна-заходнее Спас-Дземенска прарвалі моцна ўмацаваную лінію праціўніка працягам па фронту 35 км. і, перамагаючы жорсткае супраціўленне ворага, прасунуліся ўперад да 20 км. Нашы войскі наступаючыя з раёна паўднёва-ўсходнее Спас-Дземенска прарвалі ўмацаваную лінію працягам па фронту 15 км. і прасунуліся ўперад да 17 км.

За 5 дзён наступаючых баёў нашы войскі занялі звыш 150 нас. пунктаў, у тым ліку г. Спас-Дземенск. Нашы войскі прадаўжаюць наступленне, вызваляюць новыя нас. пункты і паляпшаюць свае пазіцыі. Вораг нясе цяжкія страты ў жывой сіле і тэхніцы.

### Бранскі напрамак

Нашы войскі, перамагаючы супраціўленне ворага, 13 і 14 жніўня прасоўваліся ўперад і занялі звыш 120 нас. пунктаў. 15 жніўня, зламіўшы супраціўленне праціўніка, пасля ўпорных вулічных баёў, нашы войскі авалодалі горадам Карачаў і працягвалі наступленне, прасунуліся ўперад ад 6 да 10 км, занялі звыш 70 нас. пунктаў.

На працягу 16 жніўня, нашы войскі працягвалі паспяхова развіваць наступленне і, прасунуўшыся ўперад ад 8 да 15 км., занялі звыш 130 нас. пунктаў, у тым ліку г. Жыздра.

### Харкаўскі напрамак

Нашы войскі, перамагаючы супраціўленне і контратакі праціўніка, працягвалі наступленне і з 8 па 16 жніўня занялі звыш 330 нас. пунктаў, у тым ліку гарады: Богадухаў, Трасцянец, Краснакуцк, Ахтырка, Чугуеў, буйныя насел. пункты Вялікая Данілаўка (паўтара кіламетра паўночна-усходнее Харкава), Рогань і многа другіх.

Чыгуначная дарога Харкаў—Палтава перарэзана.

* * *

За час з 8 па 17 жніўня нашы войскі на ўсіх франтах надбілі і знішчылі 376 нямецкіх танкаў, збіта 673 самалётаў праціўніка. Узяты вялікія трафеі.

## Беларуская моладзь не пакорыцца нямецкім рабаўласнікам

Красачным хараством жыла і працавала моладзь Совецкай Беларусі. Ёй былі прадастаўлены ўсе магчымасці для выбару любой прафесіі, быў адкрыт шлях для светлай будучыні—радасці і шчасця.

І вось, бандыцкія полчышчы Гітлера вераломна рынуліся на наш край, крывёй залілі зямлю, апустошылі ўсё тое, што было ў карыстанні беларускай моладзі.

Крывавыя гітлераўцы расстрэльваюць і паляць у агні беларускую моладзь, заганяюць яе ў нямецкае рабства, пад страхам смерці фашысты вярбуюць юнакоў у паліцыю і так званую «руска-народную армію» для таго, каб яны са зброяй у руках ішлі супроць сваіх братоў і бацькоў.

Перад сваей немінучай пагібеллю гітлераўцы ўзмацняюць свае крывавыя злачынствы. Немцы і іх прыхвасні—паліцаі зараз утвараюць аблавы, хапаюць нашых людзей нават з палёў, хто толькі ім папаў у рукі і закоўваюць у ланцугі фашысцкай няволі. Гітлераўцы далі ўстаноўку сваім халуям, што ў Германію можна хапаць жанчын, маючых па 2-3 дзяцей.

Да вас звяртаемся маладыя патрыёты! Не паддавайцеся нямецкім правакацыям, не аддавайце сваё жыццё у няволю і рабства фашысцкім князям і баронам.

Вы чуеце на ўсходзе грукат. Гэта Чырвоная Армія гоніць на Захад акупантаў. Скора наша Беларусь будзе вызвалена з фашысцкага палону.

Узбройвайцеся і ідзіце ў партызаны. Біце гітлераўскую нечысць усюды і ўсімі сіламі. У гэтай барацьбе вы знойдзеце свае вызваленне, свае шчасце.

## З СОВЕЦКАЙ РАДЗІМЫ

У Смаленскай вобласці работаюць 40 МТС. У вызваленых раёнах вобласці адкрываецца яшчэ 3 новых МТС.

* * *

Да пачатку сезона ўборкі хлеба калгасы Туркменіі адкрылі 1 500 ясель на 30 000 дзяцей.

# МАЛАДЫЯ ПАТРЫЁТЫ! УЗНІМАЙЦЕСЯ ЎСЕ, ЯК АДЗІН НА БАРАЦЬБУ З ВОРАГАМ

## Вялікія справы маладога воіна

Малады юнак Алесь М., нараджэння 1928 года, не пакарыўся фашыстам ехаць на далёкую чужбіну ў нямецкае рабства. Яму дарага свая сям'я, яго блізкія, яго дарагая радзіма. Алесь прышоў у партызанскі атрад і ўзяўся за зброю.

«Маленькі» партызан, як яго называюць у атрадзе, творыць вялікія справы. На яго рахунку ўжо лічыцца спушчаных пад адкос 3 варожых эшалоны. Нядаўна ён удзельнічаў у баявым паходзе з групай Івана Т., якая мінамі падарвала нямецкі паравоз і 2 браніраваныя вагоны з інструментам для рамонта рэльс.

Сваей смеласцю, адвагай і геройствам 15 гадовы Алесь карыстаецца вялікім аўтарытэтам сярод байцоў і камандзіраў атрада.

Васіль А.

## Юныя патрыёты сваей радзімы

Владзімір П. і Владзімір Р. нявольна папалі ў рукі нямецкім эксплататарам. Сэрца юнакоў напаўнялася нянавісцю да чужынцаў, якія імкнуцца зрабіць беларускую моладзь дарэмнымі паслугачамі і рабамі перад нямецкімі панамі.

—Каму мы будзем служыць?—

—Нямецкім забойцам і крывапійцам?—

Такой таямнічай думкай перажывалі два юнакі.

...Была цёмная жнівеньская ноч. У дэпо стаялі на парах тры паравозы. Валодзі рашылі зрабіць тое, аб чым у іх быў складзен план. Яны доўга не думаючы пераваялі чыгуначныя стрэлкі і ўгналі з дэпо па поўным хаду тры паравозы. Машыны з грукатам ляцелі ад немцаў туды, дзе на пуці партызанамі быў узарван мост. Некалькі хвілін і адзін за другім паляцелі ў кручізну паравозы.

Так юныя патрыёты выканалі свой доўг перад радзімай. Зараз яны ў партызанскім атрадзе, нясуць гордае званне—народных воінаў, змагаюцца супроць гітлераўскага звер'я.

Іван С.

## Шчаслівы той, хто не папаў у Германію

(Голас з нямецкай няволі)

...Я знаходжуся ў Германіі і работаю ў аднаго гаспадара. Тут яшчэ 2 рускіх дзяўчыны, 2 палякі. Усіх нас лёс аднолькавы.

Нікалай! Шчаслівы той, хто не папаў у Германію.

Владзімір Н.

...Дарагія тата і мама! Я работаю па 12-16 гадзін у суткі галоднай. Кругом няволя. Цёмна ў маіх вачах. Ох, мілыя родныя, вельмі баліць душа. Каб мела-б крыллі—паляцела-б на сваю дарагую радзіму.

Ксеня П.

Тут сказана ўсё. Гэта даслоўна кароткія вытрымкі з пісем, дайшоўшых да нашых рук, праз жалезныя краты фашысцкай цэнзуры.

Сэрца не вытрымлівае, калі чытаеш гэтыя словы, напісаныя слязамі і крывёй беларускіх людзей, з Калінкавіцкага раёна, загнаных у нямецкае рабства.

Голас замучаных беларускіх сыноў і дачок заве нас, таварышы, да яшчэ большай барацьбы з гітлераўскімі рабаўласнікамі.

## Трапным агнём па фашысцкім аўтамашынам



Партызаны з атрада Ефіма, Міхаіл К., Майсей К., Фёдар П., Сямён Ж. мінай і абстрэлам знішчылі нямецкую аўтамашыну з 8 мад'ярамі.

## У цяжкіх муках і эксплаатацыі

Нямецкія акупанты ператварылі былы Васілевіцкі торфзавод у месца насілля і цяжкай эксплаатацыі савецкіх людзей. Там зараз мучаюцца 450 савецкіх грамадзян, з іх 230 дзяцей ва ўзросце 12-14 гадоў. Усе яны не разгінаючы спіны томяцца пад фашысцкімі нагайкамі галоднымі і абарванымі.

Па 300 грам хлеба і 2 разы пахлёбкі з бурачковай батвы даюць у суткі рабочым нямецкія крывапійцы. За месячную зарплату рабочага можна купіць толькі 2 каробкі сахарыны і 90 папярос.

Спробуй толькі сказаць слова супроць нямецкіх парадкаў, то зараз-жа будзеш у жандармерыі ці паліцыі. А там ужо не шкадуюць шомпалаў. Будзеш ведаць да самай смерці.

Многія рабочыя сталі інвалідамі—без рук і пальцаў, хвараюць рознымі хваробамі. Яны не жадаюць болей работаць на карысць свайму ворагу.

Няхай ведаюць душагубы з Васілевіцкай камендатуры, што не доўга ўжо ім асталося смактаць кроў з беларускага народа.

Іван В.

## Ініцыятыва комсамольцаў

Баявымі справамі жывуць комсамольцы—падрыўнікі групы Владзіміра В. (атрад Трафіма Г.). Яны па дзелавому змагаюцца за чэсць і гонар свайго атрада. На пасняхова наступленне Чырвонай Арміі, комсамольцы адказваюць узмоцненай дыверсійнай работай па варожых камунікацыях. Днямі яны ўзарвалі 20 рэльсаў на Н скай чыгунцы, адначасова вывелі з строю паравоз і 2 платформы.

Многа жаху і неспакою наводзяць фрыцам комсамольцы падрыўгрупы Владзіміра В.

Міша К.

НА ПАРТЫЗАНСКІ ЛАД

## НААДВАРОТ

—Наш партызанскі атрад не дае немцам спакою.

НААДВАРОТ: ужо некалькі сотнеў немцаў атрымалі ад нас вечны спакой.

Рэдкалегія
Выданне Калінкавіцкага РК КП(б)Б
У—48 Зак. 118